УДК 81’1:811.161.3:82-3

# ДЫЯЛОГ ЯК КАМПАНЕНТ МАСТАЦКАГА ТЭКСТУ (НА МАТЭРЫЯЛЕ РАМАНА І. НАВУМЕНКІ «САСНА ПРЫ ДАРОЗЕ»)

***Я. Ю. Нікіценка*** (МДУ імя А. А. Куляшова)
Навук. кір. ***В. М. Шаршнёва***,
канд. філал. навук, дацэнт

Дыялог у мастацкім тэксце становіцца своеасаблівым увасабленнем рэальнай камунікацыйнай сітуацыі. Паводле В.М. Шаршнёвай, мастацкі дыялог – гэта «не проста фіксацыя зносін герояў, а важны структурны кампанент твора, які даследуецца як вынік мастацка-літаратурнай камунікацыі, суб’ектамі якой выступаюць аўтар, персанажы яго твораў і чытачы» [1].

Як відаць, дыялог мастацкага твора мае дваісты характар, бо, з аднаго боку, ён грунтуецца на жывым, натуральным маўленні, паколькі дыялагічны фрагмент, сфарміраваны праз спалучэнне маўленчых планаў аўтара і персанажа, дае чытачу магчымасць уявіць рэальную сітуацыю зносін. З другога боку, у дыялог уводзяцца аўтарскія рэмаркі, што арыентуе чытача на пэўныя змены і патрабуе кантролю за зместам выказаных персанажамі рэплік.

Менавіта дзякуючы дыялогу пісьменніку ўдаецца захаваць важную ўласцівасць мастацкага тэксту – накіраванасць да чытача і пабуджэнне да асэнсавання выказанай інфармацыі.

Структура камунікацыйнай сітуацыі ў мастацкім тэксце ўключае такія элементы, якія вызначаюць асноўную мэту дыялогу: гэта асоба адрасата і адрасанта, узаемаадносіны, сацыяльныя ролі і ролі ў ходзе гутаркі, месца і час зносін удзельнікаў дыялога.

У мастацкай літаратуры дыялогі выступаюць як яркі стылістычны прыём, сродак ажыўлення апавядання. У дыялогу звычайна раскрываюцца характары герояў. Ён з’яўляецца сродкам стварэння вобраза, прычым гэты вобраз убірае ў сябе падрабязнае апісанне знешняга і ўнутранага выгляду персанажа. З’яўляючыся неад’емным кампанентам мастацкага тэксту і той карціны свету, якую стварае аўтар, дыялог выконвае ў тэксце рэпрэзентацыйную, эстэтычную, экспрэсіўную і іншыя функцыі, выступае ў якасці сродка выражэння ідэйна-мастацкіх поглядаў пісьменніка.

## Літаратура

1. **Шаршнёва, В. М.** Дыялог як кампанент мастацкага тэксту: функцыянальна-камунікатыўны аспект (на матэрыяле твораў У. Караткевіча) / В. М. Шаршнёва // Веснік БДУ. Сер. 4. Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. – 2016. – № 2. – С. 25–31.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова